ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (1056) ● Чацвер, 6 чэрвеня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## АБМЕРКАВАНЫ Ў РЭКТАРАЦЕ

Медыцынскае абслугоўванне ва універсітэце, ход падрыхтоўкі да новага набору студэнтаў у гэтым годзе, падрыхтоўка да вучэбных і вытворчых практык і іх правядзенне на філалагічным і біялагічным факультэтах — на гэтых пытаннях была сканцэнтравана ўвага чарговага пасяджэння рэктарата, якое адбылося ў панядзелак.

Загадчыца паліклінікі М. І. Цырульнікава падрабязна далажыла аб арганізацыі спецыялізаванай медыцынскай дапамогі студэнтам розных курсаў і факультэтаў, прафілактычных аглядах і іх выніках, дыспансерызацыі хворых.

Зацікаўленая гутарка ішла па пытаннях грамадскага харчавання, санітарнага стану ў сталовых і буфетах, урачэбнага кантролю за станам здароўя спартсменаў.

Прынаўшыя ўдзел у абмеркаванні прапанавалі ўзмацніць кантроль за медыцынскімі даведкамі і лістамі непрацаздольнасці, якія прадстаўляюць абітурыенты і студэнты; санітарным станам пунктаў грамадскага харчавання і якасцю прыгатавання ежы.

Аб праграмах студэнцкай практыкі, месцах яе праходжання, цяжкасцях і праблемах гаварылі в. а. дэкана філалагічнага факультэта У. М. Лазоўскі і дэкан біялагічнага факультэта А. Ц. Пікулеў.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты пастановы.

**Наш кар.**

## ВІЗІТНАЯ КАРТКА СПЕЦЫЯЛІСТА

Універсітэцкія будні канцана навучальнага года, як заўсёды, поўныя значных падзей. І адна з іх — абарона дыпломных, своеасаблівы вынік пэўнага этапа студэнцкай працы і, можна сказаць, візітная картка маладога спецыяліста. Вось чаму мы і вырашылі пацікавіцца дыпломнікамі кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў.

— Разлучацца з людзьмі, пяць гадоў назад нясмела пераступіўшымі універсітэцкі парог і даверыўшымі нам вельмі складанае і важнае— выхаванне грамадзянскасці і навучанне прафесіі; з людзьмі, чыё жыццё так доўга працякала на нашых вачах і аб якіх міжволі думаеш як аб вялікай сям'і,— гэта заўсёды сумна, — расказвае загадчык кафедры палітэканоміі У. К. Драчоў.— Але, з другога боку, прыемна адчуваць, што мы выпускаем сёння ў самастойнае жыццё спецыялістаў, неабходных краіне, людзей, якія іменна з нашых рук атрымалі пуцёўку ў жыццё. Так што гэта радасная падзея.

— Напэўна, тэматыка дыпломных работ у кожным новым навучальным годзе мае свае асаблівасці?

— Так. У гэтым годзе, напрыклад, характэрная рыса — наяўнасць дыпломных работ, цесна звязаных з умовамі дзейнасці канкрэтных беларускіх прадпрыемстваў. Так, С. Каханскі абараніў дыпломную работу «Утварэнне і выкарыстанне фондаў эканамічнага стымулявання» на прыкладзе мінскага завода імя С. Арджанікідзе; Т. Лысікава выбрала тэмай дыпломнай работы «Крыніцы ўтварэння і выкарыстання грамадскіх фондаў спажывання» на матэрыялах шэрагу прадпрыемстваў БССР. І гэта не адзінкавыя выпадкі. Асабліва прыемна адзначыць, што частка студэнтаў была размеркавана менавіта ў тыя прадпрыемствы і ў тыя ўстановы, на матэрыялах якіх яны абаранялі дыпломныя работы, адкуль на іх паступілі заяўкі.

— Выходзіць, многія работы маюць практычнае значэнне?

— Так. І такая тэндэнцыя радуе. Дарэчы, частка работ выканана ў адпаведнасці з народнагаспадарчым планам, па тэмах, прапанаваных самім жыццём. Гэта работа В. Анцімоніка «Эканамічныя праблемы ўзнаўлення кадраў настаўнікаў», Г. Працко — «Узнаўленне навуковых кадраў БССР ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі». Дала практычныя плады для арганізацыі работы ў аддзеле працы і заработнай платы завода імя С. Арджанікідзе і ўжо названая работа С. Каханскага.

— Як вы ацэньваеце агульны ўзровень дыпломных работ сёлетніх выпускнікоў?

— Ён даволі высокі. Тут у якасці прыкладу, акрамя прыведзеных, можна назваць і работы Ю. Глебаўскага, І. Святліцкага, А. Маркавай. Вельмі сур'ёзна аднёсся да збору матэрыялаў для дыплома, пабываў на многіх прадпрыемствах лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці і Г. Бех. Тэма яго работы — «Аптымальнае размяшчэнне прадпрыемстваў лясной гаспадаркі». Ды хіба ж можна ўсіх пералічыць!

— Значыць, студэнты аднесліся да падрыхтоўкі і абароны дыпломных работ з поўнай адказнасцю?

— Не толькі студэнты, але і кіраўнікі дыпломных работ, мае калегі. І ў першую чаргу — дацэнт Ада Гаўрылаўна Сімашчанка. Карпатліва і пастаянна дапамагала яна сваім падапечным выйсці на трывалую глебу, разам з імі актыўна ўдзельнічала ў зборы матэрыялаў. Вялікую дапамогу аказваў дыпломнікам і в. а. прафесара Уладзімір Паўлавіч Васін. Прыёмы яго работы са студэнтамі без перабольшання можна назваць творчымі...

— І ў заключэнне некалькі слоў аб планах на будучае.

— Перад намі стаіць вялікая і складаная задача — рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў-выкладчыкаў. І выканаць гэтую задачу без трывалай тэарэтычнай загартоўкі студэнтаў немагчыма. Так што ў тэматыцы дыпломных работ 1975 года мы будзем прадугледжваць пытанні метадалагічнага характару. Пэўны вопыт у гэтай галіне мы напапілі ў бягучым годзе. Упэўнен, што ён прынясе свае добрыя плады...

**В. КІРЗНЕР,**
**студэнт.**





Абараняюць дыпломныя работы выпускнікі завочнага факультэта аддзялення журналістыкі. Тэма работы Вячаслава Сідзько — «Публіцыстыка Максіма Багдановіча». Уважліва слухаюць шасцікурсніка члены дзяржаўнай камісіі.

Фота **Д. Чаховіча.**

## У АПОШНІ ДЗЕНЬ ВЯСНЫ

Стартам летняй сесіі для чацвёртакурснікаў фізфака стаў экзамен па навуковаму камунізму, які прымае старшы выкладчык Віктар Іванавіч Гамаў.



...Сёння нават бялюткія воблачкі не перашкаджаюць сонцу запоўніць усю аўдыторыю. Апошні дзень вясны...

Калі я спытала ў другакурснікаў з трэцяй групы гістарычнага факультэта пра надвор'е, ніхто не даў пэўнага адказу.

— Мабыць, добрае... Для вас сёння — апошні дзень вясны, а для нас — апошні залік. Здаем «Гісторыю краін Азіі і Афрыкі», перыяд сярэдневякоўя.

Тым часам з-за дзвярэй паказалася Л. Максакава— яе адказ прагучаў першым. Некалькі крокаў — і яна аказалася ў цесным акружэнні.

— Як, кажы?

Колькі часу будуць існаваць ВНУ і студэнты, столькі будзе гучаць гэтае неўміручае «як?» — абавязковы атрыбут залікаў і экзаменаў. Што адказаць сябрам? Канешне, суцешыць: ці ж ты не здасі, калі вучыў?!

Пакуль дзяўчына заспакойвае аднакурснікаў, уваходжу ў аўдыторыю.

Залік прымае Г. М. Ліўшыц — адзін з ветэранаў БДУ. Ужо 40 гадоў ён выкладчык. Для яго гэты залік — самы звычайны, а для рабят....

Твар М. Грыневіч знешне зусім спакойны, і адказвае яна роўна, дакладна. Але я прыкмячаю, як рукі яе ў хваляванні круцяць аўтаручку.

— Па тэме вы гаварылі добра, — зазначае Гілер Маркавіч. — Некалькі пытанняў па курсу. Раскажыце аб Біруні, Авіцэне.

Выкладчык нездарма закранае галіны літаратуры, навукі, мастацтва. (Дарэчы, падобныя пытанні ён задаваў не толькі М. Грыневіч, а і іншым). У творчасці мастакоў слова і пэндзля заўсёды яскрава раскрываюцца асаблівасці эпохі, знаходзяць адлюстраванне яе тэндэнцыі. Калі ты ведаеш, напрыклад, хто такі Фірдаусі, то зможаш расказаць і аб Сярэдняй Азіі са старажытных часоў да арабскага заваявання.

З. Балашэвіч трохі нервуецца. Яе крыху бянтэжыць прысутнасць карэспандэнта. А між тым у пакоі вядзецца цікавая дзелавая размова пра каставы лад у сярэдневяковай Індыі.

— А хто такі Ван Ань-шы?

— Першы міністр Кітая, правёў шэраг рэформ у XI стагоддзі...

Слова за слова, і вось ужо гаворка ідзе пра нацыяналізацыю зямель, прыводзяцца аргументы нават з работ У. І. Леніна, параўноўваецца мінулае і сённяшняе.

Залік здадзен! Шчаслівая дзяўчына перагортвае ля дзвярэй залікоўку. Цяпер можна брацца за экзамены.

Апошні залік быў цяжкі. Гісторыя Кітая, Турцыі, Індыі, Карэі і Японіі на працягу 14 стагоддзяў — каб усё гэта вывучыць, патрэбны ўпартасць і, канешне, падрыхтоўка на працягу ўсяго семестра. Гілер Маркавіч, калі яшчэ ішлі лекцыі, праводзіў калёквіум, мэтай якога было даць студэнту магчымасць добра падрыхтавацца да заліку, прадумаць матэрыял. Цяпер жа па тэмах, што разбіраліся на калёквіуме, былі добрыя, грунтоўныя адказы.

Прайшла амаль гадзіна. Нарэшце я дачакалася першага хлопца. Ім аказаўся К. Дашко. Выкладчык слухаў яго нетаропкі адказ, а я гартала залікоўку. «Выдатна», «выдатна», «добра» — хлапчына, відаць, здольны і настойлівы. Толькі на адно пытанне не мог ён адказаць выкладчыку. Як высветлілася, адзін раз прапусціў К. Дашко заняткі— і вось на табе, гэтая тэма папалася на заліку!

— Ну, як, пераканаўся ў вялікай карысці лекцый? — смяецца выкладчык.

Разам са студэнтам выходжу з аўдыторыі. Цяпер ужо рабяты акружылі мяне. Доўга гутарылі аб сесіі, выкладчыках.

— Гілер Маркавіч на лекцыях заўсёды даваў толькі самае каштоўнае, галоўнае. Самі ведаеце, якая гэта добрая рыса выкладання!

— Залік цяжкі. Шмат дат, імён... Але ці ж ёсць немагчымае для студэнта?

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



Залік па тэарэтычнай механіцы патрабуе не меншай адказнасці, чым экзамен, лічаць студэнты 5-й групы III курса матэматычнага факультэта. Таму рыхтаваліся да яго з усёй сур'ёзнасцю. Вынік адказу залежыць і ад правільнага рашэння дадзенай задачы.

«Ці ўсё ў парадку?» — турбуецца Таіса Марчык, калі асістэнт кафедры тэарэтычнай механікі Валерый Аляксеевіч Савенкаў правярае яе задачу.

Фота **Т. Сахашчык.**

На мінулым тыдні адбыўся агульны сход камуністаў універсітэта. З дакладам «Аб ходзе выканання пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» і аб задачах па выкананню пастановы пленума ЦК КПБ ад 29 красавіка 1974 г. «Аб далейшым павышэнні дзейснасці ідэйна-палітычнай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС» выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар А. Я. Малышаў.

# ДА НОВЫХ

## З ДАКЛАДА ПРАРЭКТАРА ПА ВУЧЭБНАЙ

ЗА ПРАЙШОЎШЫЯ два гады пасля прыняцця пастановы ўся работа нашага калектыву была накіравана на рашэнне задач далейшага ўдасканалення вучэбнага працэсу на аснове яго навуковай арганізацыі, укаранення новых прагрэсіўных метадаў навучання з прымяненнем тэхнічных сродкаў, вызначэння і сістэматычнага абнаўлення навуковага зместу выкладання вучэбных дысцыплін.

У полі зроку рэктарата, партыйнай арганізацыі, факультэтаў і кафедр знаходзіліся такія асноўныя пытанні, як удасканаленне вучэбных планаў і праграм, павышэнне ўзроўню вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы ўсіх кафедр і асабліва кафедр грамадскіх навук; паляпшэнне падрыхтоўкі спецыялістаў па вячэрняй і завочнай формах навучання; паляпшэнне дзейнасці падрыхтоўчага аддзялення; здзяйсненне мер па своечасовай падрыхтоўцы да выдання падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, асабліва па навейшых напрамках навукі і тэхнікі; забеспячэнне прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў навукова-тэхнічнай інфармацыяй; удасканаленне вучэбнай, вытворчай і педагагічнай практык студэнтаў; здзяйсненне мерапрыемстваў па тэхнічнаму перааснашчэнню лабараторый, кафедр сучасным вучэбна-лабараторным абсталяваннем і прыборамі, укараненне ў вучэбны працэс электронна-вылічальнай тэхнікі, кіно, радыё, тэлебачання і іншых тэхнічных сродкаў навучання; накіраванне дзейнасці партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый на выхаванне ў студэнтаў камуністычнага светапогляду і ідэйнай перакананасці, арганізаванасці і дысцыплінаванасці, на выхаванне высокіх маральных і маральна-этычных якасцей, развіццё грамадска-палітычнай актыўнасці студэнцкай моладзі і інш.

У рашэнні ўсіх пералічаных пытанняў партыйныя арганізацыі, дэканаты, кафедры дасягнулі значных поспехаў. Так, на шэрагу факультэтаў уведзены новыя спецыялізацыі: на фізфаку — па мікраэлектроніцы, ядзернаму матэрыялазнаўству; факультэце прыкладной матэматыкі — па матзабеспячэнню АСК, матзабеспячэнню ЭВМ, прымяненню сродкаў вылічальнай тэхнікі; на біяфаку — па ахове прыроды і інш.

Пастаўлена пытанне перад міністэрствам аб уводзенні з новага навучальнага года падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасці механіка.

Да 95 кафедр, якія ёсць ва універсітэце, дабаўляюцца яшчэ тры: марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, гісторыі савецкага грамадства і псіхалогіі, па якіх у новым навучальным годзе мяркуецца ўвесці спецыялізацыю студэнтаў.

Кафедрамі ўсіх факультэтаў перагледжаны праграмы чытаемых курсаў. Уноў распрацаваны праграмы па ўсіх відах практык (вучэбнай, вытворчай і педагагічнай).

Створан агульнауніверсітэцкі навукова-метадычны савет. На ўсіх факультэтах для студэнтаў I і II курсаў распрацаваны вучэбныя графікі, якія дазволілі рэгламентаваць і кантраляваць самастойную работу студэнтаў па ўсіх вучэбных дысцыплінах.

Значна расшыраецца прыём на падрыхтоўчае аддзяленне.

За апошнія два гады лабараторыі і кабінеты факультэтаў папоўнены сучаснымі прыборамі і абсталяваннем, тэхнічнымі сродкамі навучання. У новым навучальным годзе будуць уведзены ў эксплуатацыю 10 лінгафонных кабінетаў.

Штогод павялічваецца прыём у аспірантуру. Пачата падрыхтоўка аспірантаў па новых перспектыўных напрамках навукі і тэхнікі па спецыяльнасцях фізіка і хімія плазмы, электронная тэхніка і прыборы, методыка выкладання фізікі.

У 1972-73 і бягучым навучальным годзе актывізавалася навукова-даследчая работа студэнтаў.

Прадаўжаецца канцэнтрацыя сіл і сродкаў кафедр на выкананні калектыўных, актуальных тэм НДР. Аб узросшым узроўні навуковай работы сведчыць тое, што частка тэм навуковых даследаванняў уваходзіць у дзяржаўны план развіцця народнай гаспадаркі БССР. Узрос аб'ём гаспадарча-дагаворных работ: у 1973 годзе—2354 тыс. руб., у 1974 —2505 тыс. руб.

Разам з тым у рабоце факультэтаў па выкананню ўказаных пастаноў і плана рэктарата і парткома ёсць шэраг недахопаў.

Перш за ўсё ва ўсіх падраздзяленнях мала ўвагі ўдзяляецца пытанням кантролю за ходам і якасцю выканання распрацаваных мерапрыемстваў.

Дэканаты і кафедры не ўдзяляюць належнай увагі пытанню эфектыўнага выкарыстання прафесараў і дацэнтаў у вучэбнай рабоце. Слаба пастаўлена вучэбна- і навукова-метадычная работа. Мала выдаецца падручнікаў па агульных і спецыяльных курсах.

Не выдаюцца вучэбныя графікі для студэнтаў усіх курсаў, метадычныя дапаможнікі па асобных курсах (спецкурсах), метадычныя дапаможнікі па напісанню курсавых і дыпломных работ, тэксты лекцый па асобных спецкурсах.

Недастаткова ўдзяляецца ўвагі культурна-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, асабліва ў студэнцкіх інтэрнатах.

У ходзе выканання пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» выпрабаваны розныя шляхі і сродкі для дасягнення пастаўленай задачы.

З мэтай павышэння ролі універсітэта ў агульнай сістэме вышэйшай адукацыі рэспублікі прадугледжана стварэнне навукова-метадычнага цэнтра, які будзе распрацоўваць, каардынаваць і ажыццяўляць меры, накіраваныя на павышэнне ўзроўню выкладання грамадскіх дысцыплін у вну рэспублікі.

У сучасных умовах народная гаспадарка стала адчуваць вялікую патрэбу ў спецыялістах комплексных профіляў: інжынерах-матэматы-

## З ВЫСТУПЛЕННЯЎ КАМУНІСТАЎ

**П. П. Шуба,** сакратар партбюро філалагічнага факультэта.

Адным з важных звенняў у нашай рабоце з'яўляецца падрыхтоўка маладой змены вузаўскіх работнікаў і рэгулярнае павышэнне кваліфікацыі тых, хто ўжо не першы год вядзе заняткі ў вну.

Нярэдка малады спецыяліст, малады выкладчык пасля аспірантуры фактычна не гатовы да працы ў вузаўскай аўдыторыі, са студэнцкім калектывам. Як выпраўляць такое становішча? Мне здаецца, што ў час праходжання аспірантуры трэба смялей даручаць розныя віды вучэбнай работы аспіранту, канешне, з абавязковым кантролем кіраўніка і кафедры.

Напэўна, быў небескарысным і інстытут стажорства, пасля якога найбольш здольныя маглі паступіць у аспірантуру. Практыка паказвае, што такія спецыялісты хутчэй уваходзяць у рытм жыцця вну.

Аб павышэнні кваліфікацыі. У нас усё большае распаўсюджанне атрымлівае спосаб павышэння кваліфікацыі без адрыву ад вытворчасці. Аднак пры вялікай штодзённай нагрузцы такі спосаб вялікага выйгрышу не абяцае.

**В. А. Барушка,** выкладчык геафака, партгрупорг.

Мне хочацца спыніцца на ролі партгрупы ў выкананні рашэнняў аб вышэйшай школе. Партгрупа кафедры агульнага землязнаўства стараецца задаць тон ва ўсіх пачынаннях, зрабіць усё неабходнае, каб нашы супрацоўнікі ішлі ў нагу з часам: раслі ў сваіх ведах, прыводзілі ў адпаведнасць з апошнімі дасягненнямі навукі вучэбныя праграмы, умела навучалі і выхоўвалі студэнтаў.

Так, на партыйным сходзе групы мы заслухалі інфармацыю камуніста прафесара В. А. Жучкевіча аб формах і метадах яго работы над павышэннем ідэйнага і прафесійнага ўзроўню. Ён прывёў цікавыя і павучальныя для усіх нас прыклады самастойнай работы. Вельмі карыснымі былі выступленне прафесара В. Р. Заўрыева і справаздача прафесара В. П. Якушка аб выхаваўчай рабоце са студэнтамі.

Усебакова мы абмеркавалі ўдзел выкладчыкаў і супрацоўнікаў у рабоце тэарэтычнага семінара. Была дадзена ацэнка іх дзейнасці, выказаны парады і рэкамендацыі.

Партгрупа таксама прымае ўдзел у складанні плана работы кафедры і нагрузкі выкладчыкаў, кантралюе, як яны выконваюцца, абмяркоўвае кандыдатуры пры вылучэнні на конкурс. Найбольш важныя пытанні абмяркоўваюцца на сумесных пасяджэннях партгрупы і кафедры.

Але партгрупам патрэбна дапамога і з боку парткома. Наспела неабходнасць у пастаянным абмене вопытам, у тым ліку па асобных праблемных пытаннях.

**М. С. Гарашчук,** загадчык кафедры матфака.

У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі на матфаку прыведзена ў сістэму спецыялізацыя студэнтаў. Многа ўвагі кафедры ўдзяляюць метадычнай рабоце. Выдаюцца падручнікі, ёсць канспекты лекцый па асноўных спецкурсах. Для чытання лекцый і кіраўніцтва дыпломнымі работамі былі запрошаны два акадэмікі і старшы навуковы супрацоўнік АН БССР. Палепшылася і выхаваўчая работа. Гэтаму нямала садзейнічала атэстацыя студэнтаў, арганізацыя грамадска-палітычнай практыкі.

Разам з тым перад факультэтам стаяць вялікія задачы. За апошнія 20 год па колькасці студэнтаў факультэт вырас прыкладна ў пяць разоў, а пералік кафедр, якія вядуць спецыялізацыю, не змяніўся.

Востра стаіць пытанне аб развіцці матфака. Неабходна адкрыць новыя кафедры, стварыць новыя навуковыя напрамкі ў адпаведнасці з сучасным навукова-тэхнічным прагрэсам.

**Д. М. Саковіч,** намеснік старшыні савета па навуковай рабоце студэнтаў.

Нас вельмі радуе, што з кожным годам паляпшаюцца не толькі колькасныя, але і якасныя па-

# ДАЁШ УДАРНАЕ ЛЕТА!

*Пад такім дэвізам праводзяць падрыхтоўчы перыяд усе 55 студэнцкіх будаўнічых атрадаў БДУ. З адным з іх, атрадам імя Ленінскага камсамола гістарычнага факультэта, мы прапануем пазнаёміцца бліжэй.*



**● На гарадскіх будоўлях мы атрымлівалі навыкі цаглянай кладкі. У гэтым нам дапамагалі вопытныя майстры.**



**● Уваходзілі ў «працоўны дэсант» і бетонныя работы. З імі байцы атрада цяпер добра знаёмы.**

# НАШ АТРАД—ГАРАДСКІ

Поспех любой справы залежыць перш за ўсё ад таго, які фундамент, які пачатак ёй пакладзены. СБА імя Ленінскага камсамола правёў вялікую работу па падрыхтоўцы да працоўнага семестра. Наш атрад — гарадскі. Як і ў мінулым годзе, мы працуем для горада, але за горадам — у 5 км ад гарадскога пасёлка Радашковічы, дзе здзейсніў бессмяротны подзвіг Мікалай Гастэла.

Недалёка ад вёскі Удранка ў хвойным лесе на беразе невялікай рачулкі раскінуўся комплекс піянерскіх лагераў для школьнікаў Мінска. Тут нам трэба будзе пабудаваць тры жылыя карпусы. Мы да гэтага рыхтаваліся ўвесь падрыхтоўчы перыяд. Байцы атрада прынялі ўдзел у «працоўным дэсанце» — раз у тыдзень працавалі на будаўнічым аб'екце, набываючы неабходныя навыкі. За гэты час ужо асвоена 2 тыс. рублёў капіталаўкладанняў. Можна сказаць, што працоўны семестр для байцоў атрада пачаўся яшчэ у канцы сакавіка. Гэта дапамагло пазнаць свае сілы і здольнасці.

Работу на будоўлі атрад актыўна спалучаў з вялікай агітацыйна - прапагандысцкай работай: агітбрыгада выступала з канцэртамі, лектарская група чытала лекцыі рабочым-будаўнікам.

Вялікая работа вядзецца па падрыхтоўцы да 30-годдзя вызвалення Беларусі і 50-годдзя прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Праведзен аўтапаход па месцах вызваленчых баёў у Мінскай вобласці, атрад пабываў на месцы гібелі Героя Савецкага Саюза Мікалая Гастэлы, сабраны матэрыялы аб яго жыцці і подзвігу. Байцы рашылі змагацца за права залічыць М. Гастэлу ў спіс асабовага саставу атрада.

Рыхтуемся мы аказаць дапамогу мясцовай школе, збіраем бібліятэчку неабходных кніг. Раней мы перадалі бібліятэчку з твораў У. І. Леніна камсамольскай арганізацыі БМУ «Мінскрадыёбуд».

Вялікую ўвагу ўдзяляем спартыўнай рабоце. Байцы прымалі актыўны ўдзел ва ўсіх спартыўных мерапрыемствах факультэта і універсітэта. Усе члены атрада — значкісты ГПА.

Належыць сказаць аб высокай грамадскай актыўнасці кожнага. Гэтаму ў многім садзейнічае асаблівая структура атрада: створаны партыйная група, камсамольскае бюро, група ваенна-патрыятычнай работы, рэдкалегія, спартыўнае бюро.

СБА імя Ленінскага камсамола актыўна ўключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва мінскіх гарадскіх атрадаў. Мы спаборнічаем са СБА «Сонечны» хімічнага факультэта.

У. КАРАГІН.

# ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ!

## РАБОЦЕ БДУ ПРАФЕСАРА А. Я. МАЛЫШАВА

ках, інжынерах-фізіках, біяхіміках, біяфізіках. Вопыт работы шэрагу вну краіны (Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут, Новасібірскі універсітэт) паказвае, што праблема падрыхтоўкі такіх спецыялістаў паспяхова рашаецца ў садружнасці з адпаведнымі прадпрыемствамі, навуковымі і праектна-канструктарскімі арганізацыямі. У нас такія сувязі ўстаноўлены шэрагам кафедр фізічнага факультэта з вытворчым аб'яднаннем «Інтэграл», інстытутамі фізікі і цеплamасаабмену, ядзернай энергетыкі АН БССР, факультэтам прыкладной матэматыкі з заводам імя Арджанікідзе і іншымі. Смялей і энергічней павінны ўстанаўліваць і развіваць такія сувязі іншыя факультэты і кафедры.

Задача універсітэта — рыхтаваць спецыялістаў шырокага дыяпазону. Ёй падпарадкаваны новыя вучэбныя планы, якім належыць рашаючая роля ў вызначэнні аптымальнага зместу універсітэцкай адукацыі. Новыя вучэбныя планы па ўсіх спецыяльнасцях уводзяцца з 1 верасня 1974 года. Зараз ужо зразумела, чым адрозніваюцца гэтыя планы ад дзейнічаючых цяпер. Яны даюць лепшыя суадносіны паміж тэарэтычнай і практычнай, агульнанавуковай і спецыяльнай падрыхтоўкай кадраў; больш дакладна вызначаюць асноўныя аспекты падрыхтоўкі студэнтаў, наменклатуру вучэбных дысцыплін і ўдзельную вагу кожнай з іх у агульнай сістэме навучання і фарміравання будучага спецыяліста. У новыя вучэбныя планы ўкладзена большая гібкасць для адбору факультатыўных і альтэрнатыўных дысцыплін. Узмоцнена роля фундаментальных навук у падрыхтоўцы студэнтаў як базы не толькі для вывучэння спецыяльных дысцыплін, але і далейшай дзейнасці выпускнікоў універсітэта ў зменлівых умовах вытворчасці, прагрэсу навукі і тэхнікі. У новых вучэбных планах знайшоў адлюстраванне ўжо пачаты працэс спалучэння навучання з абавязковай навукова-даследчай работай студэнтаў, паменшана ў значнай меры іх вучэбная нагрузка і ўзрасла доля самастойных заняткаў, кантралюемых выкладчыкам. Аднак належыць помніць, што якімі б добрымі ні былі планы, поспех будзе дасягнут толькі пры правільнай іх рэалізацыі. Размова ідзе не толькі аб якасці чытання лекцый і правядзення іншых відаў заняткаў, але і аб правільным разуменні ролі, месца і значэння кожнага з іх. Так, гаворачы аб узмацненні падрыхтоўкі студэнтаў па фундаментальных навуках, мы маем на ўвазе не простае павелічэнне колькасці гадзін у вучэбным плане, а перш за ўсё павышэнне навуковага ўзроўню агульнанавуковых і спецыяльных курсаў, ліквідаванне разрыву паміж агульнанавуковымі і спецыяльнымі дысцыплінамі.

Расшырэнне маштабаў вучэбна-даследніцкай работы студэнтаў патрабуе ад кафедр і дэканаў самай пільнай увагі да ўсіх відаў вучэбнай работы, дзе максімальна праяўляецца самастойнасць студэнтаў (семінары, лабараторныя, курсавыя і дыпломныя работы), з мэтай звядзення іх у адзіную сістэму, якая спалучаецца з удзелам студэнтаў у рабоце навуковых гурткоў, таварыстваў, канструктарскіх бюро.

Што датычыцца праграм, то няспыннае абнаўленне іх, выключэнне ўстарэлага або другараднага матэрыялу, насычэнне іх навейшымі дасягненнямі навукі і тэхнікі дазволіць захаваць навуковы ўзровень універсітэцкай адукацыі не толькі сённяшняга, але і заўтрашняга дня. Неабходна ўдасканальваць і метады навучання. У асноўным яны застануцца традыцыйнымі. Аднак нельга не ўлічваць цалкам заканамерны і прагрэсіўны працэс так званай «індустрыялізацыі» адукацыі, насычэнне яго рознымі тэхнічнымі сродкамі, што адпавядае сучасным тэндэнцыям навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Сучасны універсітэт немагчымы без шырокага насычэння рознымі дэманстрацыйнымі прыстасаваннямі, аўтаматызаванымі сродкамі зваротнай сувязі і кантролю ведаў, прыборамі для размнажэння дапаможных графічных матэрыялаў, магнітафонамі індывідуальнага карыстання, ЭВМ, якія працуюць у рэжыме дыялогу з навучаемым, малымі лічбавымі машынамі і г. д. Больш інтэнсіўна, чым мы гэта пакуль робім, трэба ўкараняць вучэбнае кіно і тэлебачанне. Кожнай кафедры трэба весці сур'ёзную работу па ўкараненню тэхнічных сродкаў навучання.

У справе павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў важнейшую ролю адыгрывае марксісцка-ленінская адукацыя студэнтаў, высокі ўзровень выкладання грамадскіх дысцыплін.

Нам неабходна прадаўжаць работу па забеспячэнню адзінства навучання і выхаваўчага працэсу, паслядоўна ўзмацняючы пераемнасць у арганізацыі і правядзенні ўсёй выхаваўчай работы.

Далейшае павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў прама звязана з пастаноўкай і зместам практыкі, якая з'яўляецца натуральнай і арганічнай састаўной часткай вучэбнага працэсу. Задача заключаецца ў тым, каб вытворчую практыку студэнтаў перавесці ў рэжым факультэцкіх абавязковых заняткаў па індывідуальных планах, якія прадугледжваюць максімальную самастойнасць практыкантаў і павышэнне іх асабістай адказнасці за выкананне праграм практыкі. На кожнай прафіліруючай кафедры неабходна дабівацца, каб студэнты ў перыяд практыкі выконвалі па індывідуальных заданнях самастойныя работы ў выглядзе рэальных праектаў, навуковых даследаванняў, удзельнічалі ў правядзенні эксперыментальных работ і ўкараненні іх вынікаў. Спецыяльным кафедрам належыць планаваць вывучэнне часткі вучэбнага матэрыялу ў перыяд практыкі.

Вялікія задачы стаяць і перад кафедрамі грамадскіх навук, якія абавязаны забяспечыць правядзенне на прадпрыемствах і ва ўстановах грамадска-палітычнай практыкі сумесна з мясцовымі грамадскімі арганізацыямі.

Партыя і ўрад пастаянна клапоцяцца аб вышэйшай школе, даюць ёй усё і патрабуюць ад яе поўнай аддачы для хутчэйшага росту магутнасці нашай Радзімы. Пленум ЦК КПБ, які адбыўся ў красавіку гэтага года, абмеркаваў пытанне аб ідэалагічнай рабоце ў рэспубліцы, удзяліўшы пры гэтым немалую ўвагу вышэйшай школе. 23 мая 1974 года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову, у якой прадугледжана развіццё універсітэта на бліжэйшыя 15 год — да 1990 года. У Шчамысліцы будуць пабудаваны вучэбна-лабараторныя карпусы, будынкі культурна-бытавога прызначэння, спецкафедры, спартыўнага комплексу, інтэрнатаў, а таксама жыллё для прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Кантынгент студэнтаў да 1990 года будзе складаць прыкладна 20 000 чалавек. Штогадовы прыём студэнтаў на ўсе формы навучання — каля 4 000 чалавек.

Як бачым, многае нам ужо дадзена, многае мы атрымаем у бліжэйшай і больш далёкай перспектыве, і задача заключаецца ў тым, каб спаўна, прыклаўшы максімальныя намаганні, справай адказаць на клопаты партыі і ўрада аб нашым універсітэце.

---

казчыкі ўдзелу студэнтаў у навукова-даследчай рабоце.

У 1973 годзе, напрыклад, на усесаюзны конкурс саветамі факультэтаў было прадстаўлена 26 студэнцкіх работ. Аўтары чатырох з іх узнагароджаны медалямі «За лепшую навуковую работу ў краіне», а трох — дыпломамі міністэрства і ЦК ВЛКСМ. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў сярод вну краіны.

Цяперашні, V Усесаюзны конкурс, прайшоў больш арганізавана. На універсітэцкіх канферэнцыях заслухана 923 студэнцкія даклады. Каля 300 аўтараў сталі пераможцамі I тура. На рэспубліканскі конкурс было накіравана 164 работы, 33 студэнты атрымалі дыпломы першай ступені, а іх работы накіраваны на заключны тур; 95 работ аднесены да II катэгорыі, 40—да III. 72 студэнты ўзнагароджаны дыпломамі міністэрства і граматамі ЦК ЛКСМБ.

За паспяховае кіраўніцтва студэнцкімі даследаваннямі і актыўны ўдзел у арганізацыі конкурсу граматамі міністэрства ўзнагароджаны прафесар М. Я. Шкляр, дацэнты І. О. Царук, В. Ф. Працко, Г. Е. Марціновіч, М. П. Квочкін, У. К. Драчоў, Т. І. Прытыцкая.

Аднак не ўсе выкладчыкі грамадскіх навук, у тым ліку і камуністы, прынялі актыўны ўдзел у конкурсе. Павінны больш канкрэтна займацца пытаннямі конкурсу камітэты камсамола, асабліва прыродазнаўчых факультэтаў.

Месяц назад савет падвёў вынікі навукова-даследчай работы студэнтаў на факультэтах. Лепшымі ў аглядзе-конкурсе прызнаны філфак і біяфак.

**М. Р. Круцько,** загадчык кафедры навуковага камунізму.

Пасля пастановы аб вышэйшай школе многа зроблена, у тым ліку і у БДУ. Павысіўся навуковы ўзровень выкладання. Шырэй і глыбей раскрываюцца праблемы развіцця матэрыяльнага свету і грамадска-палітычных працэсаў. Больш аргументаванай становіцца крытыка буржуазнай ідэалогіі, антыкамунізму, розных апартуністычных канцэпцый. Цікавейшымі, больш змястоўнымі сталі лекцыі і семінарскія заняткі.

Адзін з важнейшых паказчыкаў павышэння навуковага ўзроўню выкладання — паляпшэнне арганізацыі, тэматыкі, чытання спецкурсаў і правядзення спецсемінараў. Але гэту работу трэба прадаўжаць. Неабходна пазбегнуць дубліравання, чытаць спецкурсы і праводзіць спецсемінары па найбольш актуальных праблемах.

У арганічнай сувязі з павышэннем узроўню выкладання грамадскіх дысцыплін знаходзіцца паляпшэнне ўсёй справы інфармацыі. Тут ёсць пэўныя зрухі, але неабходнасць больш аператыўнай інфармацыі відавочная. Тут больш поўна трэба выкарыстоўваць гарадскія семінары выкладчыкаў.

**У. М. Сікорскі,** рэктар БДУ.

Коратка спынюся на пытаннях развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта. У гэтым годзе будзе ўведзен у эксплуатацыю вучэбны корпус у Шчамысліцы. Ёсць меркаванні перавесці туды пакуль спецыялізуючыя кафедры фізфака і старэйшыя курсы, якія займаюцца на іх базе. Гэта дазволіць палепшыць умовы матэматычнага факультэта, часткова біялагічнага і юрыдычнага.

Пачалося будаўніцтва корпуса для ІПК, з уводам яго расшырацца плошчы філфака і выдавецтва.

У пачатку 1975 года ўвойдзе ў строй інтэрнат на 1000 месц па вуліцы Кастрычніцкай. У Шчамысліцы засяляецца новы будынак інтэрната.

Да новага навучальнага года мяркуецца адкрыць сталовую ў галоўным корпусе на 140 месц. Вядзецца рэканструкцыя сталовай па вул. Кастрычніцкай і праектуецца новая сталовая на 300 месц.

Велізарную работу належыць зрабіць у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР аб развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта.

Сур'ёзную ўвагу трэба звярнуць на закупку імпартнага абсталявання. Усе факультэты і кафедры павінны актыўна ўключыцца ў гэту работу.

* * *

У абмеркаванні даклада таксама прынялі ўдзел дэкан ФПМ Я. А. Іваноў, старшыня прафбюро юрыдычнага факультэта В. Кудзін.

---

## Правафланговыя

У партыйнай групе нашага атрада — 9 камуністаў. Падрыхтоўчы перыяд паказаў, што гэта лепшыя байцы. Так, камандзір Уладзімір Карагін многае зрабіў па сфарміраванню атрада, арганізацыі працоўных дэсантаў. Камісар Валерый Дашкевіч, адказны за ідэалагічную работу, прыклаў нямала намаганняў для падрыхтоўкі выездаў з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, выступленняў лектараў. Дзейсна дапамагаў яму адказны за лекцыйную работу камуніст Усевалад Грыняк.

Урач Таня Шаўцова старанна сачыла, каб у атрад былі адабраны самыя здаровыя байцы. Старшыня рэвізійнай камісіі Уладзімір Трамбіцкі прыдзірліва правярае ўсе грашовыя сродкі, якія паступаюць у фонд атрада.

Камуністы Уладзімір Мядзелец (майстар), Мікалай Кобрын (старшыня спортбюро), Віктар Кароль (член рэвізійнай камісіі) выдатна спраўляюцца са сваімі ўчасткамі работы. Усе камуністы — члены штаба атрада, і на іх раўняюцца астатнія байцы.

**Л. ШЫДЛОЎСКАЯ,**
**партгрупорг**

## «ЛЯТУЧАЯ»

У агітбрыгадзе атрада 17 чалавек, але пяцёра з нас складаюць асобую, «лятучую» брыгаду. Яе праграма, прысвечаная 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, разлічана на кароткія выступленні ў час абедзенных перапынкаў у цэхах і на палявых станах у раёне дыслакацыі атрада.

У час падрыхтоўчага перыяду мы далі тры канцэрты, два з іх—для будаўнікоў.

Першы раз мы выступалі на аб'яднаным камсамольскім сходзе байцоў нашага атрада і моладзі БМУ «Мінскрадыёбуд». Другі канцэрт быў прама на будоўлі ў абедзенны перапынак. Рабочыя самі дапамагалі нам абсталёўваць імправізаваную сцэну і аднесліся да нашага выступлення вельмі цёпла, добразычліва. Некаторыя нумары нават прыйшлося паўтарыць.

Так што праверку гледачом наш маленькі калектыў вытрымаў паспяхова. Мы вельмі рады гэтаму.

**Р. ВАЛІЕВА,**
**адказная за работу агітбрыгады.**



Апалубку вядуць Юрый **Голубеў** і Юрый **Кірылаў**.



**Байцы атрада ля дома, дзе нарадзіўся народны паэт Беларусі Якуб Колас. У цэнтры — брат паэта Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч.**

## НА РАДЗІМЕ ПАЭТА

Нядаўна мы ўсім атрадам наведалі месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Пабывалі ў доміку, дзе нарадзіўся паэт, наведалі філіял музея Якуба Коласа на Мікалаеўшчыне. Нас радушна сустрэў брат паэта Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч, якому зараз 79 год.

Іосіф Міхайлавіч шмат цікавага расказаў аб дзяцінстве паэта, аб пачатку яго літаратурнай і рэвалюцыйнай дзейнасці, аб сваёй сям'і, бацьках паэта. Асабліва цёпла ён адгукаўся аб дзядзьку (у паэме дзядзька Антось). Нас глыбока ўсхвалявала выдатнае веданне ім паэзіі Якуба Коласа. Ён чытаў напамяць урыўкі з многіх твораў паэта.

Іосіф Міхайлавіч паказаў нам хату, дзе раней жылі Міцкевічы, рэчы, якімі яны карысталіся, абстаноўку таго часу.

Надоўга запомніцца гэтая сустрэча з чалавекам, які блізка ведаў вялікага паэта.

**В. БАЛЦЭВІЧ.**

«Тебя, как первую любовь,
России сердце не забудет».
Ф. Тютчев.

Усё, ёлкі, дубы, бярэзнік, сцяжынкі і дарогі, палі, лугі, рэчкі і азёры— усё, як верш Пушкіна, ясны, хвалюючы. Усё вакол настолькі насычана і як бы дыхае яго светлым імем, што нідзе больш не адчуваеш сябе так блізка да ўяўляемага жывога паэта.

Здаецца, прыкмечана ўсё, і ўсё перанесена на лісткі паперы. У Міхайлаўскім, Трыгорскім, Пушкінскіх Гарах (Святых Гарах) ходзіш з паэтычным адчуваннем, склаўшымся з яго радкоў. Вось і «двух озер лазурные равнины» — гэта Кучане і Маленец. «Дикий садик. Берег сонных вод» — гэта, вядома, Сораць.



175

# У МІХАЙЛАЎСКІМ

Па берагах рассыпаліся вёскі, а за імі «скривилась мельница, насилу крылья ворочая при ветре». І там, дзе ўгору падымаецца дарога, тры сасны стаяць. А «у лукоморья — дуб зелёный...».

Усё ён. І ўсё — аб ім. І калі прыязджаеш у гэтую самую глыбакаводную Прыстань Пушкіна, то ўсё, што было прачытана ў дзяцінстве, што ўрэзалася ў памяць і заўсёды свяціла чыстым і крыху сумным агеньчыкам, становіцца рэальным, зямным.

Міхайлаўскае на кожным кроку радуе жывым Пушкіным. Нават у Святагорскім манастыры, дзе марозным лютаўскім ранкам быў пахаван паэт, дзейнічае на пачуцці не магіла; бяруць у палон карціны з «Барыса Гадунова». Летапісец Пімен. Ноч. Келля ў Чудавым манастыры...

Тут сам Пушкін, падобна летапісцу, праседжваў, працаваў у келлі, у бібліятэцы, гутарыў са свяшчэннаслужыцелямі.

Паяўляўся ён і на ярмарцы ў Святых Гарах. «Сарочка чырвоная, нябрыты, нястрыжаны, як ёсць, кій жалезны ў руках, прыйдзе ў народ, сядзе на зямлю, збярэ да сябе жабракоў, яны яму песні спяваюць», — успамінае адзін з сучаснікаў пэта...

Усё — ён. І ўсё — аб ім. Жыва, непасрэдна, рознакалярова, шырока, праўдзіва, чыста і ясна.

...Вось домік няні Аляксандра Сяргеевіча Арыны Радыёнаўны. Справа — лазня, тут Пушкін прымаў ванну, калі з наступленнем халадоў не мог купацца ў Сораці. У святліцу да няні прыходзіў, калі было асабліва сумна і адзінока. Сюды ён ішоў адпачыць, паслухаць яе цудоўныя казкі. Тут — усё простае, рускае, утульнае. Сундукі, лаўкі. у кутку, пад іконамі, стол, пакрыты даматканым настольнікам. У другім кутку — руская печ з ляжанкай, на сцяне — пучкі духмяных траў. Каля печы стаяць медны самавар, гліняныя бутэлькі для дамашніх налівак...

Міхайлаўскае... А. П. Керн была тут толькі аднойчы...

...«Я помню чудное мгновенье...». Гэты верш першай прачытала яна...

«Я буду мыслею всегдашней
Бродить Тригорского кругом,
В лугах, у речки над холмом,
В саду под сенью лип домашней».

І ходзіць. Толькі тут, у Міхайлаўскім, і можна зразумець сэнс слоў, якія належаць Сямёну Сцяпанавічу Гейчанку, хранiцелю Пушкінскага запаведніка: «Калі будзеце ў Міхайлаўскім, абавязкова схадзіце як-небудзь вечарам на ўскраіну парку, станьце тварам да маленькага возера і гучна крыкніце: «Аляксандр Сяргеевіч!» Запэўню вас, ён абавязкова адкажа: «Іду-у!»

**У. ТАЛЯРОНАК,**
**студэнт журфака.**

*А. С. ПУШКІН*

* *
*

*Сябры мае, цудоўны наш саюз!*
*Нібы душа, ён непадзельны, вечны,*
*Ён непарушны, вольны і сардэчны,*
*Ён рос пад засенню сяброўскіх муз.*
*Куды б нас ні закінула судзьбіна*
*І шчасце нас куды б ні павяло,*
*Мы тыя ўсе: нам цэлы свет чужына;*
*Нам бацькаўшчынай Царскае Сяло.*
*Выгнаннікам я на зямлі слыву,*
*Па свеце гнаны доляю суровай,*
*З сардэчнай шчырасцю да дружбы новай*
*У стоме нахіліў я галаву...*
*З тужлівою, з мяцежнаю мальбою,*
*З даверлівай надзеяй год былых*
*Сябрам другім аддаўся я душою;*
*Ды горкім быў прывет нябрацкі іх...*

**Урывак з верша «19 кастрычніка»**
**ў перакладзе**
**Аркадзя КУЛЯШОВА.**



Ва універсітэцкай бібліятэцы.

# СТУДЭНЦКІ СЯБРА

Людзі з самымі разнастайнымі інтарэсамі могуць знайсці ў насценнай газеце «Савецкі юрыст» нешта для сябе: тэматыка матэрыялаў тут рознабаковая.

Напрыклад, пра справы камітэта камсамола расказвае артыкул студэнта І. Рэуцкага. Гутарка ідзе аб арганізацыі універсітэта прававых ведаў для студэнтаў Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава, у якім зараз актыўна супрацоўнічаюць студэнты-юрысты. Ахвотна прадастаўляе газета свае старонкі для справаздач аб дыспутах і гутарках у групах.

Вучоба і грамадская работа, які ён, выдатнік, выхаванне студэнта — вось кола пытанняў, якія закранае газета. Яна не замоўчвае злабадзённых праблем студэнцтва, імкнецца не выйсці з рытму працоўнага жыцця факультэта.

Вучацца рабяты, рыхтуюцца да сваёй будучай працы. А каб быць да яе бліжэй, каб наблізіць тэорыю да практыкі, яны арганізуюць сустрэчы з выпускнікамі факультэта. І гэта цікавая, карысная справа добра асвятляецца на старонках насценнай газеты.

Прынцыповую размову вядзе «Савецкі юрыст» аб недахопах. Чаму пражэктар не «свеціць»? Ці ўсё зроблена для сустрэчы сесіі?

Вучоба, праца і побач, канешне, літаратурная старонка. Тут змешчаны вершы студэнта вячэрняга аддзялення Басецкага «Дзе дом стаяў», «Першая сустрэча», рэцэнзія Л. Пырскага «Хто я такі і чым я жыву», дзе ён расказвае аб творах свайго сябра — Валерыя Вышкевіча.

Цікавыя малюнкі, гумарэскі... Увогуле, газета стварае добрае ўражанне, але не абыходзіцца і без недакладнасцей, аднатыпных заметак. Трэба сказаць і аб афармленні. Па-першае, добра тое, што газета мае нумар выпуску, вядомы састаў рэдкалегіі. Па-другое, тут змяшчаюцца вельмі яркія малюнкі, ёсць добрыя фотаздымкі. Хацелася б толькі бачыць падзел газетнага матэрыялу на старонкі ці хаця б на аддзелы. Гэта дазваляла б адразу адшукаць патрэбны матэрыял. **Т. НЕЎПАКОЕВА.**

# ЯШЧЭ РАЗ АБ АДПАЧЫНКУ

Праблема свабоднага часу... Здаецца, якая тут можа існаваць праблема? Наведай вечар адпачынку або схадзі ў тэатр, у кіно. У значнай большасці людзей паняцце аб адпачынку асацыіруецца са зменай абставін. Бо адпачынку не будзе, калі не будзе зменен звыклы будні рытм, ліквідавана напружанасць.

Паглядзім, як абстаяць справы ў гэтым напрамку ў журналістаў.

Амаль усе студэнты факультэта журналістыкі пражываюць у інтэрнаце № 3. Усе знаёмы паміж сабой, але чаму так сумна там вечарамі?

Студсавет вырашыў даць бой шэрасці, разбудзіць ад суму жыхароў інтэрната, зацікавіць іх якой-небудзь справай.

Было вырашана правесці першынство пакояў па футболу. Уся моцная палова ажывілася. Якія толькі назвы каманд не былі прыдуманы рабятамі! «Аксакалы», «Бярозка», «Крылы Саветаў». Але ўсё спынілася на назвах... Большая частка каманд у спаборніцтвах удзелу не прыняла. І зноў у інтэрнаце сум.

Абрадаваліся журналісты, калі было аб'яўлена аб стварэнні на факультэце інструментальнага ансамбля. Студэнты з энтузіязмам працавалі ў аб'яднанні «Крышталь», зарабляючы грошы на інструменты. Цяпер ансамбль ёсць, але не вырашана пытанне, дзе ж праводзіць вечары. Праблема адпачынку засталася.

У мінулым годзе я пабываў у адным з інтэрнатаў Гомельскага універсітэта. Студэнты арганізавалі свой маладзёжны клуб, збіраюцца там вечарамі.

А калі нам пераняць іх вопыт і паспрабаваць арганізваць такі клуб! Для пачатку хоць бы ў межах інтэрната. Можна прыдумаць розныя конкурсы, сур'ёзныя і займальныя. Напрыклад, конкурс на лепшага кулінара сярод... рабят або КВЗ. Тады і планы студсавета не будуць сумнымі.

Не трэба думаць, што наш адпачынак— гэта клопат аднаго студсавета або кіраўнікоў факультэта. Кожны студэнт павінен і можа прыняць непасрэдны ўдзел у арганізацыі карыснага правядзення вольнага часу.

**А. ШАЎКО.**

## ПА СТАРОНКАХ НАСЦЕНГАЗЕТ

# ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

АГУЛЬНАВЯДОМА, наколькі важную ролю адыгрывае насценная газета ў жыцці калектыву. Напэўна ўсе разумеюць і той факт, што яна павінна быць перш за ўсё аператыўнай, актуальнай, найбольш поўна і глыбока адлюстроўваць нашу рэчаіснасць. Толькі тады яна стане неад'емнай часткай у жыцці кожнага.

А зараз давайце паглядзім, як выконваюць сваё прызначэнне дзве насценныя газеты — «Мерыдыян» геафака і «Віта» біяфака. Возьмем апошнія нумары.

Святочны выпуск «Мерыдыяна» прысвечан майскім урачыстасцям. Маляўнічая, багата ілюстраваная цікавымі фотаздымкамі газета. Знешне яна вельмі ўражлівая, але давайце пачытаем матэрыялы.

Першым кідаецца ў вочы перадавы артыкул. Тут гаворыцца аб узнікненні Першамайскага свята, аб удзеле студэнтаў-географаў у дэманстрацыі працоўных горада, а затым, амаль без сувязі з напісаным вышэй, ідзе пералік гераічных працоўных подзвігаў камсамольцаў розных пакаленняў. Скразны ход думкі парушан, тэма не вытрымана.

Яшчэ адзін матэрыял — невялікая заметка «ГПА — здабытак усіх», аўтар якога студэнт А. Кашынскі абмежаваўся толькі агульнымі словамі аб назначэнні і сістэме ГПА. А пра ход здачы норм гэтага комплексу студэнтамі — ні слова.

У асноўным газета ў дастатковай ступені асвятляе агульнае становішча спраў на факультэце. Тут ёсць і звесткі аб правядзенні ленінскага суботніка — фотарэпартаж «Чырвоная субота», і заметка аб справаздачна-выбарным сходзе, і расказ аб рабоце танцавальнага гуртка. Але глыбокіх па змесце матэрыялаў, якія б узнімалі важныя праблемы студэнцкага жыцця, тут няма. Усё зроблена неяк крыху па-школьнаму, павярхоўна.

Праўда, гэта не датычыцца аддзела сатыры і гумару. Вясёлыя жарты, смешныя цытаты са студэнцкіх курсавых і кантрольных работ, адказаў надаюць газеце больш жывасці, у нейкай меры кампенсуюць адносную шэрасць іншых матэрыялаў. Справядліва, у гранічна з'едлівай форме крытыкуецца ў газеце камсамольскі пражэктар.

Але паглядзім у правы ніжні вугал старонкі, дзе павінны быць і парадкавы нумар, і дата выпуску, і хто выпускаў газету. Нічога з пералічанага няма!

Апошні нумар газеты «Віта» таксама прысвечан знамянальнай даце — днюнасць студэнтаў. нараджэння У. І. Леніна. На першым плане пад партрэтам Ільіча змешчаны успаміны Н. К. Крупскай аб вялікім правадыру.

У параўнанні з «Мерыдыянам» «Віта» некалькі прайграе ў афармленні. Тут няма такой яркасці, ды і якасць фотаздымкаў крыху горшая. Але яна найбольш адпавядае тым патрабаванням, якія прад'яўляюцца да насценнай газеты. Разнастайнасць жанраў, актуальнасць, глыбокі падыход да тэмы, аналіз фактаў —вось што характарызуе гэты нумар. Матэрыялы строга згрупаваны па аддзелах, забяспечаны рубрыкамі і падзагалоўкамі.

Надзвычай цікавай па змесце, важнай па свайму значэнню з'яўляецца карэспандэнцыя Л. В. Кахновіч, загадчыка кафедры фізіялогіі раслін «Адзін на адзін з канферэнцыяй». Тут на аснове глыбокага аналізу фактаў аб адбыўшыхся навуковых канферэнцыях выказаны слушныя меркаванні і прапановы аб тым, як праводзіць абмеркаванне дакладаў, як павысіць актыўнасць студэнтаў.

Ёсць тут і такі жанр, як інтэрв'ю. Можна зрабіць вывад, што газета асвятляе не выпадковыя з'явы, а імкнецца больш глыбока адлюстраваць тыя пытанні і праблемы, якія хвалююць студэнтаў і выкладчыкаў. Пэўна таму яна мае такі шырокі аўтарскі актыў.

Вельмі часта практыкуецца форма размовы з масавым чытачом. Рэдкалегія прапаноўвае пытанні па пэўнай тэме, а студэнты адказваюць на іх, выступаюць са сваімі думкамі, пажаданнямі, планамі. У гэтым нумары змешчана вялікая, на палову старонкі падборка «Што мы чытаем». Якое месца займае мастацкая літаратура ў жыцці кожнага, што яна дае, над чым прымушае паразважаць, якія кнігі і літаратурныя жанры найбольш падабаюцца — аб гэтым змястоўна, шчыра расказваюць біёлагі.

Рабіць вывад — на якога чытача, у адрозненне ад «Мерыдыяна», арыентуецца «Віта» — няма патрэбы.

Аднак ні адну, ні другую газету нельга пахваліць за аператыўнасць. Настаў чэрвень, ідзе экзаменацыйная сесія (ці ж не падзея ў жыцці студэнтаў, якая павінна быць абавязкова адлюстравана ў насценным друку), а рэдкалегіі геафака і біяфака аб гэтым чамусьці не думаюць. Зразумела, што часу вельмі не хапае, асабліва цяпер, але ж такое становішча спраў усё-такі недаравальна.

**В. МІКУЛКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём—1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 11242 Тыраж 2000 экз. Зак. 799.